ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 3 (242) | Субота, 22 студзеня 1977 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ВЫДАТНЫ ПОДЗВІГ

### АБ УРУЧЭННІ ГОРАДУ-ГЕРОЮ ТУЛЕ МЕДАЛЯ «ЗАЛАТАЯ ЗОРКА»

**За мужнасць і стойкасць, праяўленыя абаронцамі Тулы пры гераічнай абароне горада, якая адыграла важную ролю ў разгроме нямецка-фашысцкіх войск пад Масквой у перыяд Вялікай Айчыннай вайны, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР гораду Туле прысвоена ганаровае званне «Горад-герой».**

**На тульскай зямлі — вялікае свята. Для ўручэння гораду-герою медаля «Залатая Зорка» прыбыў Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш Л. І. Брэжнеў.**

**18 студзеня ў будынку Драматычнага тэатра імя М. Горкага адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае ўручэнню гораду медаля «Залатая Зорка».**

**У зале сабраліся партыйныя, савецкія, прафсаюзныя і камсамольскія работнікі, перадавікі прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў, творчая інтэлігенцыя, актыўныя ўдзельнікі абароны горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, воіны Савецкай Арміі, шматлікія госці.**

**Гарачай авацыяй, стоячы, сустрэлі ўдзельнікі ўрачыстага пасяджэння таварыша Л. І. Брэжнева.**

**У прэзідыуме — знатныя людзі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, кіраўнікі дэлегацый гарадоў-герояў Масквы, Ленінграда, Валгаграда, Севастопаля, Адэсы, Кіева, Мінска, Новарасійска, Керчы, Крэпасці-героя Брэста, кіраўнікі дэлегацый гарадоў Калугі і Разані, якія спаборнічаюць з Тулай. На пасяджэнні выступіў з прамовай Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш Л. І. Брэжнеў.**

**Прамова Л. І. Брэжнева была выслухана з вялікай увагай і неаднойчы перапынялася працяглымі апладысментамі.**

**Таварыш Л. І. Брэжнеў апавясціў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні Туле звання «Горад-герой» і прымацаваў медаль «Залатая Зорка» да сцяга горада.**

**У падарунак жыхарам Тулы таварыш Л. І. Брэжнеў перадаў бронзавую скульптуру «Рабочы са сцягам».**

**З вялікім натхненнем удзельнікі пасяджэння прынялі прывітальнае пісьмо Цэнтральнаму Камітэту КПСС, Прэзідыуму Вярхоўнага Савета СССР, Савету Міністраў СССР.**

**(ТАСС).**

## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

Пазаўчора ў актавай зале адбылося пашыранае пасяджэнне Вучонага савета. Быў заслуханы і абмеркаваны даклад прарэктара па навуковай рабоце прафесара М. В. Навучыцеля «Вынікі навукова-даследчай работы і падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў за 1976 год».

Справаздача аб гэтым Вучоным савеце будзе змешчана ў наступным нумары нашай газеты.

## СІЛАМІ ДЗВЮХ КАФЕДР

У гонар 60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі кафедры эканомікі працы і галіновых эканомік нашага ўніверсітэта заключылі дагавор аб сумесным правядзенні «Дзён навукі» на прамысловых прадпрыемствах г. Гомеля і вобласці. Такая форма лекцыйнай прапаганды дазволіць пашырыць тэматыку лекцый і кола слухачоў.

Нядаўна адбыўся выезд лектараў на Гомельскі шклозавод імя Ламаносава, дзе было прачытана 8 лекцый для рабочых калектываў цэхаў і ўчасткаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў.

Дацэнт кафедры эканомікі працы Л. А. Салохіна прысвяціла сваё выступленне пытанню паляпшэння выкарыстання рабочага часу як важнейшаму фактару роста прадукцыйнасці працы.

Дацэнт кафедры галіновых эканомік Т. Д. Трацэўская гаварыла аб фактарах павышэння эканамічнай эфектыўнасці прамысловай вытворчасці ў 10-й пяцігодцы. Выкладчык гэтай жа кафедры П. А. Дуброўскі прачытаў лекцыю аб міжнародным становішчы і аб праблемах народанасельніцтва.

Аўтар гэтых радкоў расказала аб уплыве сацыяльна-псіхалагічнага аспекта кіравання на павышэнне прадукцыйнасці працы ў вытворчых калектывах.

У «Днях навукі», якія праходзілі ў Светлагорскім раёне, прынялі ўдзел прафесар С. А. Кім, дацэнты У. Д. Арэшчанка і І. П. Трацэўскі. На прамысловых прадпрыемствах і ў саўгасах раёна імі прачытана 9 лекцый.

Аб удасканальванні сістэмы кіравання ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС атрымалі інфармацыю інжынерна-тэхнічныя работнікі аўтакамбіната, цёлюлозна-папяровага камбіната, Васілевіцкай ГРЭС.

На Светлагорскім камбінаце штучнага валакна, у будтрэсце № 20, у домабудаўнічым камбінаце прачытаны лекцыі аб удасканальванні ўпраўленчай працы.

Аб эканамічнай палітыцы партыі ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС лекцыі праслухалі рабочыя саўгасаў і гандлёвыя работнікі Светлагорскага раёна.

**Э. ЛІЗАРАВА,**
**старшы навуковы супрацоўнік НДС.**

## РЫХТУЕЦЦА РЭЗЕРВ ПРАПАГАНДЫСТАЎ

У студзені на гісторыка-філалагічным факультэце з ліку студэнтаў старэйшых курсаў пачалася падрыхтоўка рэзерву прапагандыстаў. Лекцыі для іх чытаюць выкладчыкі кафедр грамадскіх навук — кандыдат эканамічных навук, дацэнт У. Ц. Смірноў, кандыдаты гістарычных навук дацэнт В. В. Серыкаў, В. У. Матусевіч, У. І. Качаткоў і іншыя вучоныя. Вучэбная праграма разлічана на 40 гадзін. Для будучых прапагандыстаў прачытаны ўжо лекцыі «Змест і мэты партыйнай прапаганды», «Ленінскія прынцыпы партыйнай прапаганды», «Метады правядзення палітзаняткаў» і іншыя.

Вучоба закончыцца здачай залікаў. Разам з дыпломамі аб вышэйшай адукацыі 50 выпускнікоў факультэта атрымаюць пасведчанні аб грамадскай прафесіі — прапагандыста.

**Я. ВЯРШЫГАРА,**
**дэкан факультэта грамадскіх прафесій.**

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі ўніверсітэта, выкладчыкі і студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта горача віншуюць выкладчыка кафедры беларускай літаратуры ЛІТВІНАВА Радзівальда Кірылавіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.**

### Дзённік сесіі

## ЗА ПАСПЯХОВАСЦЬ УСЕ Ў АДКАЗЕ

ЗІМОВАЯ сесія, як кажуць, перайшла экватар. Усё менш пустых клетак застаецца ў экранах паспяховасці. А запоўненыя дазваляюць ужо зрабіць некаторыя вывады. Як заўсёды, прыемна за выдатнікаў. Зусім іншае ўражанне, калі глядзіш на прозвішчы, супраць якіх на экране стаяць нездавальняючыя адзнакі. Такія студэнты сапсавалі настрой не толькі сабе, але і падвялі выкладчыкаў, таварышаў па групе. Менавіта ад узроўню паспяховасці ў многім будзе залежыць, якая група стане пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар 60-годдзя Вялікага Кастрычніка на курсе, факультэце, ва ўніверсітэце.

Зараз слова тым, хто найбольш заклапочаны паспяховасцю студэнтаў.

**І. П. ТРАЦЭЎСКІ, дэкан эканамічнага факультэта:**

— Вынікі бягучай сесіі ў цэлым нас задавальняюць. Студэнты паказалі глыбокія веды па грамадскіх навуках, чацвёртакурснікі паспяхова здалі экзамены па спецыяльных дысцыплінах. З выстаўленых адзнак амаль палавіна — «добрыя» і 24 працэнты — «выдатныя». У спаборніцтве пасля чатырох экзаменаў лепшыя паказчыкі мела група Т-41. Тут толькі пяць чалавек атрымалі здавальняючыя адзнакі, веды астатніх адзначаны высокімі баламі. На 19 студзеня не было двоек і ў групах Т-43, 0-32, 0-42.

На жаль, сёлета падвялі нас другакурснікі. На экзаменах па тэорыі верагоднасці і матэматычнай статыстыцы яны атрымалі 36 двоек. Адназначны адказ аб прычыне такіх слабых ведаў цяжка даць. Але як бы там ні было, другакурснікі прыкметна пацягнулі ўніз агульны ўзровень паспяховасці студэнтаў усяго факультэта.

**У. Я. МАЦЮШЭНКА, нам. дэкана фізічнага факультэта:**

— З бягучага навучальнага года наш факультэт пераходзіць на індывідуальны план навучання. Яго перавагі выявіліся адразу ж. Напрыклад, у папярэднія гады, як правіла, самая нізкая паспяховасць была ў першакурснікаў. Цяпер па апошніх даных яна складае ў іх 91,3 працэнта, (у цэлым жа па факультэту — 80,9). Старанна працавалі па індывідуальнаму плану выкладчыкі кафедры вышэйшай матэматыкі. Таму і веды першакурснікаў па гэтай дысцыпліне сёлета аказаліся значна лепшымі, чым гэта была раней.

Паспяхова здаюць экзамены студэнты чацвёртага курса. А вось у студэнтаў другога і трэцяга курсаў справы ідуць значна горш. Праўда, у пэўнай ступені тут ёсць аб'ектыўныя прычыны. З пераходам на індывідуальны план навучання на іх долю выпала вялікая нагрузка, і бягучую сесію можна лічыць самай цяжкай. Асабліва непасільным для многіх трэцякурснікаў аказаўся экзамен па метадах матэматычнай фізікі.

**У. Ф. ФІЛІПЦОЎ, дэкан механіка-матэматычнага факультэта:**

— Бягучая сесія нас мала радуе. Па апошніх дадзеных паспяховасць студэнтаў складала ўсяго 71 працэнт. Гэта значна ніжэй мінулагодняга.



**Дацэнт кафедры рускай літаратуры М. І. Рыбакоў застаўся задаволены вынікамі экзамена па зарубежнай літаратуры, які здавалі яму студэнты чацвёртага курса аддзялення рускай мовы і літаратуры гісторыка-філалагічнага факультэта. Выдатнай адзнакай ацаніў ён веды многіх студэнтаў, у тым ліку і Надзежды Макаравай, якую вы бачыце на гэтым здымку.**

Фота **А. Карніенкі.**

Своеасаблівы «рэкорд» устанавіла група М-42, 16 студэнтаў якой на экзамене па функцыянальнаму аналізу (экзаменатар У. В. Мухін) атрымалі нездавальняючыя адзнакі.

Неяк увайшло ў традыцыю спачатку называць лепшых студэнтаў. Мне ж хочацца пачаць з тых, хто недобрасумленнымі адносінамі да вучобы цягне факультэт назад. Сярод такіх — Раіса Малышава і Міхаіл Чэрапаў з групы М-45, якія на двух экзаменах «праваліліся» і да аднаго былі не дапушчаны, Ала Кашпур з групы М-41, таксама атрымаўшая дзве двойкі, а на адзін экзамен наогул не з'явілася, хаця не было ніякіх уважлівых прычын.

Канешне, у сілу сваіх магчымасцей і здольнасцей не ўсе студэнты могуць займацца аднолькава. Аднак у той групе, дзе пануе таварыскасць, узаемавыручка, пастаянная працоўная творчая атмасфера, вынікі гавораць самі за сябе. На факультэце лепшай па паспяховасці з'яўляецца група М-21. У гэтым вялікая заслуга яе старасты Юрыя Пашкоўскага, які паказвае асабісты прыклад у вучобе, а таксама аднаго з лепшых куратараў факультэта С. І. Буракоўскай. У гэтай групе толькі на «выдатна» здалі тры экзамены браты Аляксандр і Сяргей Каморнікавы, Ірына Асвяцімская, Галіна Пакаташкіна.

**В. Ф. КАРАПАЦЕНКА, сакратар геалагічнага факультэта:**

— Будучыя геолагі трымаюць зімовую сесію нармальна. Пасля трох экзаменаў сярэдняя паспяховасць складае 93,1 працэнта. Палавіна пастаўленых адзнак — «добрыя», больш 18 працэнтаў — «выдатныя». На гэтай сесіі самымі высокімі баламі ацэнены веды А. Літвіна, Я. Мутара, Н. Вярэнка. Па дзве выдатныя адзнакі і па адной добрай атрымалі І. Паўлаў, У. Ашурка і іншыя студэнты факультэта.

...Да канца зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі засталіся лічаныя дні. Многім яна прынесла радасць. На жаль, сёлета нямала і такіх студэнтаў, каму спатрэбіцца яшчэ шмат папрацаваць, каб ліквідаваць «хвасты». Іменна тады і будуць падведзены і ўсебакова прааналізаваны канчатковыя вынікі зімовай сесіі-77.

## 60-годдзю Вялікага Кастрычніка —

# САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ

## КАЛЕКТЫВУ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА НА 1977 ГОД

Натхнёны грандыёзнымі сацыяльна-эканамічнымі задачамі, вызначанымі XXV з'ездам КПСС, аднадушна падтрымліваючы і горача адабраючы ўнутраную і знешнюю палітыку Ленінскай партыі і Савецкага ўрада, калектыў Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта поўны рашучасці працаваць у другім годзе дзесятай пяцігодкі пад лозунгам «Працаваць лепш, павышаць эфектыўнасць і якасць». Як канкрэтную праграму дзеянняў успрынялі работнікі ўніверсітэта рашэнні Кастрычніцкага (1976 г.) Пленума ЦК КПСС, палажэнні і вывады, выказаныя ў прамове Генеральнага сакратара ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжнева.

Кіруючыся пастановай ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ «Аб Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы, паспяховае выкананне заданняў дзесятай пяцігодкі» і ідучы насустрач 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, прафесарска-выкладчыцкі састаў, навуковыя супрацоўнікі, рабочыя і служачыя, студэнты і аспіранты ГДУ прынялі высокія сацыялістычныя абавязацельствы, выкананне якіх будзе садзейнічаць паляпшэнню якасці і павышэнню эфектыўнасці вучэбнага працэсу, вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і палітыка-выхаваўчай работы сярод студэнтаў.

### I. ПАЛЯПШЭННЕ ЯКАСЦІ І ПАВЫШЭННЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСУ І ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЙ РАБОТЫ

1. Рэктарату, партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацыям ўніверсітэта накіраваць арганізатарскую і ідэйна-палітычную работу на ўсямернае разгортванне сацыялістычнага спаборніцтва за паспяховае пераўтварэнне ў жыццё сацыяльна-эканамічных задач, вызначаных XXV з'ездам КПСС, шырока разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу 60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістчнай рэвалюцыі, уцягнуць у яго ўвесь прафесарска-выкладчыцкі, вучэбна-дапаможны і адміністрацыйна-гаспадарчы персанал універсітэта.

**(На працягу ўсяго года, адказн. — рэктарат, партком, мясцком).**

2. Працягваць работу па распрацоўцы і зацвярджэнню на Вучоным савеце ўніверсітэта пашпартаў спецыяльнасцей і спецыялізацый, дакладна вызначыўшы пры гэтым адпаведны пералік спецкурсаў і спецсемінараў.

**(Чэрвень 1977 г., адказн. — рэктарат, дэканаты, кафедры).**

3. Правесці падрыхтоўчую работу па вызначэнню неабходнасці ў падрыхтоўцы спецыялістаў - біёлагаў для народнай гаспадаркі, у прыватнасці, для сельскай гаспадаркі.

4. З мэтай забеспячэння падрыхтоўкі высокаадукаваных спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй і для паляпшэння якасці ўсяго комплексу вучэбна-метадычнай работы ва ўніверсітэце сістэматычна і настойліва дабівацца далейшага павышэння навукова-тэарэтычнага і метадычнага ўзроўню чытання лекцый, спецкурсаў, правядзення лабараторных, практычных і семінарскіх заняткаў.

**(На працягу года, адказн. — вучэбны аддзел, дэканаты, кафедры).**

5. Падтрымаць ініцыятыву дэканата і партыйнай арганізацыі фізічнага факультэта па стварэнню філіялаў кафедр ГДУ ў акадэмічных інстытутах, СКБ і на прадпрыемствах з мэтай паляпшэння падрыхтоўкі спецыялістаў, удасканальвання спецыялізацый, комплексавання навукова-даследчай работы.

**(Ліпень 1977 г., адказн.—дэканаты, кафедры, партбюро, прафбюро).**

6. Эфектыўней укараняць у вучэбны працэс тэхнічныя сродкі навучання. Кафедрам, бібліятэцы і іншым падраздзяленням універсітэта поўнасцю асвоіць сродкі, выдзеленыя рэктаратам у 1977 годзе на абсталяванне кабінетаў і лабараторый. Абсталяваць на кожным факультэце не менш адной лекцыйнай аўдыторыі для выкарыстання кіно ў вучэбным працэсе.

**(На працягу года, адказн. — вучэбны аддзел, дэканаты, кафедры).**

7. Шырэй прыцягваць да кіраўніцтва вытворчай практыкай, студэнцкімі і дыпломнымі работамі вучоных і спецыялістаў народнай гаспадаркі; умацоўваць сувязі факультэтаў, кафедр з адпаведнымі падраздзяленнямі іншых ВНУ, прадпрыемствамі прамысловасці, НДІ, СКБ, школамі.

**(На працягу года, адказн. — рэктарат, дэканаты, вучэбны аддзел, кафедры).**

8. Распрацаваць сістэму мерапрыемстваў па паляпшэнню вучэбнай работы і аказанню дапамогі студэнтам першых—другіх курсаў у авалодванні ведамі.

**(Верасень, 1977 г., адказн. — дэканаты, метадычны савет, метадычныя камісіі).**

9. З мэтай вывучэння навейшых даследаванняў у галіне навучання і выхавання студэнтаў і абмену вопытам правядзення вучэбных заняткаў на ўсіх факультэтах арганізаваць работу навукова-метадычных семінараў па актуальных праблемах вузаўскай педагогікі.

**(На працягу года, адказн. — вучэбны аддзел, дэканаты, метадычныя камісіі).**

10. Прадоўжыць работу навукова-метадычнага семінара куратараў студэнцкіх груп, абагуліць вопыт выхаваўчай работы куратараў і правесці агульнаўніверсітэцкую канферэнцыю куратараў на тэму «Шляхі паляпшэння выхаваўчай работы ў студэнцкай групе».

**(Верасень — кастрычнік 1977 г., адказн.—рэктарат, партком, мясцком).**

11. Абагуліць работу факультэтаў і кафедр па сувязі з агульнаадукацыйнай школай і выпусціць зводныя матэрыялы, адлюстроўваючыя развіццё гэтай работы ў 1977 годзе.

**(Сакавік—красавік 1977 г., адказн. — рэктарат, партком, мясцком).**

12. Удасканальваць і працягваць вучобу выкладчыкаў праграмавання. На працягу года навучыць лабарантаў карыстацца сродкамі экранізацыі і іншымі тэхнічнымі сродкамі навучання.

**(Снежань 1977 г., адказн. — вучэбны аддзел, кафедры).**

### II. НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ РАБОТА І ПАДРЫХТОЎКА НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫХ КАДРАЎ.

1. Павысіць значэнне навукова-даследчых работ па гаспбюджэтнай тэматыцы. Дабіцца ўключэння ўсіх тэм у каардынацыйныя планы важнейшых навукова-даследчых работ.

**(Адказн. — рэктарат, навуковы аддзел, кафедры).**

2. Своечасова і высакаякасна выконваць заданні па вырашэнню важнейшых народнагаспадарчых праблем.

**(Адказн. — рэктарат, навуковы аддзел, навуковыя кіраўнікі).**

3. Давесці гадавы аб'ём гаспдагаворных работ да 900 тысяч рублёў.

**(Адказн. — рэктарат, навуковы аддзел, факультэты, кафедры).**

4. Значна павысіць эканамічную эфектыўнасць ад укаранення закончаных навукова-даследчых работ. Агульную суму эканамічнага эфекта ад укаранення закончаных распрацовак давесці да 1800 тысяч рублёў.

**(Адказн. — рэктарат, навуковы аддзел, факультэты, кафедры).**

5. Узняць патэнтаздольнасць выконваемых навукова-даследчых работ па дзяржбюджэту і гаспдагаворах. Падаць у Камітэт па справах вынаходніцтваў і адкрыццяў пры Савеце Міністраў СССР не менш 10 заявак.

**(Адказн. — рэктарат, факультэты, навуковы аддзел).**

6. Падрыхтаваць да выдання не менш 12 манаграфій, кніг, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, у тым ліку прадставіць у дзяржаўныя выдавецтвы 5 манаграфій, кніг, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

**(Адказн. — рэктарат, факультэты, кафедры, навуковы аддзел).**

7. Падрыхтаваць для экспанавання на ВДНГ БССР і ВДНГ СССР не менш 7 экспанатаў.

**(Адказн. — рэктарат, факультэты, кафедры, навуковы аддзел).**

8. Актывізаваць удзел навукова-педагагічных супрацоўнікаў універсітэта ў міжнародных, саюзных, занальных і рэспубліканскіх канферэнцыях, з'ездах і сімпозіумах. На працягу года зрабіць не менш 200 навуковых дакладаў і паведамленняў на канферэнцыях, з'ездах, сімпозіумах, у тым ліку: на міжнародных—2, усесаюзных — 115, занальных — 5, рэспубліканскіх—78.

**(Адказн. — факультэты, кафедры).**

9. Падрыхтаваць да апублікавання ва ўсесаюзных і рэспубліканскіх выданнях не менш 205 артыкулаў.

**(Адказн. — факультэты, кафедры).**

10. Палепшыць якасны састаў навукова-тэхнічных кадраў універсітэта, прадставіць да абароны не менш 3 доктарскіх і 20 кандыдацкіх дысертацый.

**(Адказн. — рэктарат, навуковы аддзел, факультэты, кафедры).**

11. Павысіць эфектыўнасць падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў. Выпуск аспірантаў з абаронай або прадастаўленнем да абароны давесці да 70 працэнтаў.

**(Адказн. — рэктарат, кафедры, навуковыя кіраўнікі).**

12. Шырэй выкарыстоўваць пасады навуковых супрацоўнікаў для заканчэння работ над доктарскімі дысертацыямі. У 1977 годзе перавесці на пасады навуковых супрацоўнікаў двух адпаведных навуковых работнікаў універсітэта.

**(Адказн. — рэктарат, навуковы аддзел, кафедры).**

13. Прафесарска- выкладчыцкаму саставу ўніверсітэта сістэматычна павышаць ідэйна-тэарэтычны ўзровень і кваліфікацыю праз сістэму палітасветы, ІПК, ФПК, стажыроўку і іншыя формы навучання. Накіраваць у 1977 годзе на павышэнне кваліфікацыі праз ІПК, ФПК, стажыроўку не менш 86 чалавек, г. зн.

# ДТСААФ СССР—50 ГАДОЎ

Заўтра спаўняецца 50 гадоў Чырвонасцяжнаму абароннаму таварыству. З гэтай знамянальнай датай супадае яшчэ адна значная падзея ў жыцці ДТСААФ — 25—26 студзеня бягучага года ў Маскве адбудзецца XIII з'езд Усесаюзнага Добраахвотнага Таварыства садзейнічання Арміі, Авіяцыі і Флоту.

Да свайго залатога юбілею і XIII з'езда Усесаюзнае Добраахвотнае Таварыства падыйшло цесна згуртаваным вакол Ленінскага Цэнтральнага Камітэта КПСС, арганізацыйна ўзмоцненым. Цяпер ДТСААФ — актыўная грамадская сіла, калектыў патрыётаў, які аб'яднаў у сваіх радах звыш 76 мільёнаў савецкіх людзей.

У пярвічных калектывах, а іх налічваецца звыш 320 тысяч, у вучэбных арганізацыях вядзецца мэтанакіраваная выхаваўчая, абаронна-масавая і спартыўная работа.

Пярвічная арганізацыя ДТСААФ нашага ўніверсітэта аб'ядноўвае ў сваіх радах больш 5 тысяч членаў абароннага таварыства. На факультэтах, кафедрах і ў падраздзяленнях ГДУ праводзіцца вялікая работа па ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта. Толькі ў мінулым годзе 2635 членаў ДТСААФ займаліся ў секцыях і камандах ваенна-тэхнічнымі відамі спорту. Праведзена таксама больш 20 стралковых спаборніцтваў, з іх: 14 — па мнагабор'ю ГПА, 12 — па ваенна-прыкладному мнагабор'ю. Прачытана 267 лекцый, дакладаў і праведзена гутарак на ваенна-патрыятычную тэму. Адбылося каля 30 сустрэч з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і знатнымі людзьмі горада, арганізавана 18 паходаў па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа.

У гонар 50-годдзя ДТСААФ СССР былі праведзены стралковыя спаборніцтвы паміж факультэтамі ўніверсітэта. Першае месца заняла каманда эканамічнага факультэта, другое — механіка-матэматычнага, трэцяе — фізічнага.

Лепшыя асабістыя вынікі паказалі Н. Белавусава (біялагічны факультэт), В. Арлова з эканамічнага і А. Судакоў з геалагічнага факультэтаў.

Найбольш плённа працуе калектыў пярвічнай арганізацыі ДТСААФ эканамічнага факультэта (старшыня Н. Петрушэнка). Ён вядзе работу ў цесным кантакце і ўзаемадзеянні з камітэтам камсамола і прафсаюзнай арганізацыяй факультэта. Усе пытанні па ваенна-патрыятычнаму выхаванню і абаронна-масавай рабоце вырашаюцца тут заўсёды паспяхова.

Вялікую дзейнасць па выхаванню актыву вядуць члены прэзідыума камітэта ДТСААФ, былыя старшыні камітэта пярвічнай арганізацыі абароннага таварыства ўніверсітэта П. У. Жукаў і А. С. Пешаў.

Усе калектывы пярвічнай арганізацыі ДТСААФ ГДУ прынялі павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы і разам з усім савецкім народам актыўна ўключыліся ў спаборніцтва за дастойную сустрэчу 60-годдзя Вялікага Кастрычніка.

**У. ДЗЕМ'ЯНКОЎ,**
**старшыня камітэта ДТСААФ універсітэта.**

# МАЦНЕЮЦЬ СУВЯЗІ СА ШКОЛАЙ

Выкладчыкі кафедры рускай мовы падтрымліваюць традыцыйныя цесныя сувязі з настаўнікамі-славеснікамі сярэдніх і васьмігадовых школ г. Гомеля і вобласці. Многія з іх прынялі актыўны ўдзел у правядзенні студзеньскіх настаўніцкіх канферэнцый Гомельшчыны. Напярэдадні выезду выкладчыкаў у школы вобласці метадыст кафедры старшы выкладчык М. Н. Корсакава расказала ім аб асаблівасцях новых школьных праграм па рускай мове, аб найбольш важных пытаннях методыкі яе выкладання ва ўмовах інтэрферэнцыі.

Дацэнты кафедры Т. С. Янкова, В. І. Мядзведзева, старшы выкладчык А. І. Лашкевіч, выкладчыца Р. М. Казлова, асістэнты А. В. Кузняцова і аўтар гэтых радкоў пазнаёмілі ўдзельнікаў раённых настаўніцкіх канферэнцый з найбольш тыповымі памылкамі ў вусных адказах і пісьмовых работах абітурыентаў, якія летась паступалі ва ўніверсітэт.

У дакладах Т. С. Янковай, В. І. Мядзведзевай, Р. М. Казловай, з якімі яны выступілі на канферэнцыях у Добрушскім, Веткаўскім і Хойніцкім раёнах, закраналіся актуальныя пытанні словаўтваральнага, марфемнага і этымалагічнага аналізу слоў у практыцы выкладання рускай мовы ў школе. Жывую цікавасць настаўнікаў Акцябрскага раёна выклікала выступленне старшага выкладчыка А. І. Лашкевіча, якое было прысвечана паказу ролі рускай мовы як сусветнай у сучасных умовах.

А. В. Кузняцова пазнаёміла настаўнікаў Рэчыцкага раёна з асноўнымі патрабаваннямі да ўступных экзаменаў па рускай мове, вызначыла шляхі паляпшэння падрыхтоўкі абітурыентаў па гэтай важнай дысцыпліне.

Увазе ўдзельнікаў настаўніцкай канферэнцыі Брагінскага раёна быў прадстаўлены даклад «Аб выкарыстанні тапанімікі на пазакласных занятках па рускай мове». Выкладчыкі кафедры адказалі на пытанні настаўнікаў, правялі для іх кансультацыі, вызначылі тэмы будучых выступленняў.

**У. КОВАЛЬ.**

*дастойную сустрэчу!*

# АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

20 працэнтаў усяго прафесарска-выкладчыцкага саставу.

**(Адказн. — рэктарат, вучэбны і навуковы аддзелы).**

14. Арганізаваць і правесці на высокім узроўні вузаўскі тур VII Усесаюзнага агляду-конкурсу студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху.

**(Адказн. — рэктарат, Савет па НДРС, факультэты, кафедры, навуковы аддзел).**

15. Прадставіць на рэспубліканскі і Усесаюзны агляды-конкурсы 1977 года па прыродазнаўчых і гуманітарных навуках не менш 270 работ, звярнуўшы асаблівую ўвагу на іх якасць.

**(Адказн. — рэктарат, Савет па НДРС, факультэты, кафедры, навуковы аддзел).**

## III. ПАЛІТЫКА-ВЫХАВАЎЧАЯ І ПАЗАВУЧЭБНАЯ РАБОТА.

1. Праверыць работу па абнаўленню нагляднай агітацыі; з гэтай мэтай у галоўным корпусе ўніверсітэта аформіць стэнд «Рашэнні XXV з'езда КПСС — увасабленне ідэй Вялікага Кастрычніка».

**(Верасень 1977 г., адказн. — партком, камітэт камсамола, прафком, АГЧ).**

2. У гонар 60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і 50-годдзя ДТСААФ арганізаваць і правесці па факультэтах зорныя паходы па месцах баявой і працоўнай славы савецкага народа.

**(Студзень—верасень 1977 г., адказн. — камітэт ДТСААФ, камітэт ЛКСМБ, дэканаты, мясцком, прафком).**

3. Усім выкладчыкам кафедр грамадскіх навук праслухаць цыкл лекцый «Знешнепалітычная дзейнасць КПСС у святле рашэнняў XXV з'езда КПСС», арганізаваны ва ўніверсітэце таварыствам «Веды», ІМЗ СССР і МЗС СССР.

**(Студзень—красавік 1977 г., адказн. — партком, кафедры грамадскіх навук).**

4. У інтэрнатах універсітэта арганізаваць сустрэчы «За круглым сталом», праводзіць дыспуты, літаратурныя вечары з заслужанымі работнікамі вытворчасці, ударнікамі 9-й пяцігодкі, прадстаўнікамі інжынерна-тэхнічнай і творчай інтэлігенцыі, пісьменнікамі, паэтамі, прысвечаныя рашэнням XXV з'езда КПСС і 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялісытчнай рэвалюцыі.

**(На працягу года, адказн.—дэканаты, кафедры, камітэт ЛКСМБ, прафком, студсаветы).**

5. Арганізаваць выступленні ва ўніверсітэце кіруючых работнікаў раёна, горада і вобласці, прысвечаныя актуальным сацыяльна-палітычным і народна-гаспадарчым праблемам па рэалізацыі рашэнняў XXV з'езда КПСС.

**(На працягу года, адказн. — партком, мясцком, камітэт камсамола, прафком).**

6. Усім выкладчыкам, якія вядуць лекцыйныя заняткі па гуманітарных дысцыплінах, правесці па патоках студэнцкія навукова-практычныя канферэнцыі, прысвечаныя 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

**(На працягу года, адказн. — кафедры грамадскіх навук, дэканаты).**

7. На высокім ідэйна-палітычным узроўні правесці Ленінскі залік «Рашэнні XXV з'езда КПСС—у жыццё!».

**(Верасень 1977 г., адказн. — камітэт ЛКСМБ).**

8. У гонар 60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі падтрымаць ініцыятыву біялагічнага і гісторыка-філалагічнага факультэтаў па ўпарадкаванню зялёных зон г. Гомеля. Пад кіраўніцтвам біёлагаў па ўзгадненню з дырэкцыяй парку культуры і адпачынку правесці такія работы ў лесапарку за ракой Сож.

**(Сакавік 1977 г., адказн. — дэканаты, камітэт ЛКСМБ, прафком).**

9. Выкладчыкам універсітэта прачытаць для насельніцтва горада і вобласці не менш 1200 лекцый. Праўленню ўніверсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды» распрацаваць тэматыку лекцый і дакладаў, прысвечаных рашэнням XXV з'езда КПСС і 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Кафедрам праводзіць на прадпрыемствах, у калгасах, саўгасах і школах «Дні навукі» па спецыялізаванай тэматыцы.

**(Сакавік—кастрычнік 1977 г., адказн. — партком, аддзяленне таварыства «Веды», кафедры, школа маладога лектара).**

10. Павысіць якасць грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў, абагуліць і распаўсюдзіць на ўсіх факультэтах станоўчы вопыт яе правядзення, дабіцца павышэння сацыяльнай актыўнасці студэнтаў, набыцця імі навыкаў масава-палітычнай работы ў калектыве. У канцы года правесці навукова-метадычную канферэнцыю па арганізацыі грамадска-палітычнай практыкі.

**(Снежань 1977 г., адказн. — дэканаты, вучэбны аддзел, кафедры грамадскіх навук, рэдакцыя газеты «Гомельскі ўніверсітэт».)**

11. Пачаць работу кіналекторыя, арганізаваць паказ мастацкіх кінафільмаў, а таксама навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных стужак, прысвечаных актуальным пытанням знешняй і ўнутранай палітыкі КПСС і Савецкага Саюза.

**(На працягу года, адказн. — рэктарат, прафком, клуб мастацкай самадзейнасці).**

12. Ажыццяўляць выпуск радыёгазет у інтэрнатах.

**(На працягу года, адказн. — камітэт камсамола, прафком, студсаветы).**

13. Правесці агульнаўніверсітэцкую алімпіяду «Здароўе» па 8 відах спорту сярод супрацоўнікаў і студэнцкую ўніверсіяду — па 25 відах спорту. Падрыхтаваць 8 майстроў спорту, 17 кандыдатаў у майстры, 70 спартсменаў першага разрада і 950 спартсменаў масавых разрадаў. Дабіцца здачы нарматываў па ГПА не менш 22-мя працэнтамі студэнтаў.

**(На працягу года, адказн. — спортклуб, дэканаты, кафедра фізвыхавання).**

14. Весці далейшае павышэнне працоўнай дысцыпліны ва ўніверсітэце. З гэтай мэтай вывучыць пытанні невыкарыстання рабочага часу вучэбна-дапаможным персаналам.

**(Верасень 1977 г., адказн. — эканамічны факультэт).**

15. Забяспечыць гадавы прыём у санаторый-прафілакторый 14 змен па 75 чалавек у змену. Павысіць культуру абслугоўвання і санітарны стан усіх памяшканняў і харчаблоку прафілакторыя, абсталяваць неабходнай мэбляй і інвентаром жыллёвыя пакоі. Для медыцынскіх кансультацый студэнтаў прыцягнуць на грамадскіх пачатках тэрапеўта, неўрапатолага, кардыёлага і іншых спецыялістаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага саставу ўніверсітэта.

**(На працягу года, адказн. — мясцком, прафком).**

16. Дабіцца поўнага і якаснага выканання мерапрыемстваў грамадзянскай абароны (абучэнне супрацоўнікаў і студэнтаў, падрыхтоўка фарміраванняў ГА, здача нарматываў, залікаў і экзаменаў па грамадзянскай абароне, наяўнасць дакументаў, планаў ГА і баявой падрыхтоўкі, стварэнне вучэбна-матэрыяльнай базы і куткоў ГА).

17. Актыўна ўдзельнічаць у грамадскай рабоце па ахове працы, тэхніцы бяспекі і пажарнай бяспекі. Пастаянна трымаць у чысціні рабочыя месцы, павышаць культуру працы, праяўляць наватарства і разумную ініцыятыву. Ашчадна выкарыстоўваць спецвопратку, спецабутак, інструмент, інвентар і мэблю.

18. Правесці мерапрыемствы па эканоміі электрычнай энергіі, гаруча-змазачных матэрыялаў і цеплавой энергіі. Сэканоміць у 1977 годзе два працэнты электраэнергіі і 2,5 працэнта гаруча-змазачных матэрыялаў.

**(Адказн. — АГЧ).**

19. Да канца года асвоіць сродкі на капітальны рамонт вучэбных карпусоў і інтэрнатаў на суму, выдзеленую ўніверсітэту на 1977 год.

**(Адказн. — АГЧ).**

20. Правесці агляд насценнага друку факультэтаў.

**(Да 5 мая, адказн. — партком, камітэт камсамола, мясцком, прафком, рэдакцыя газеты «Гомельскі ўніверсітэт»).**

21. Правесці агляд мастацкай самадзейнасці факультэтаў, прысвечаны 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

**(Люты—сакавік, адказн. — партком, мясцком, камітэт камсамола, прафком).**

## IV. АРГАНІЗАЦЫЯ І ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА

1. У мэтах павышэння палітычнай і працоўнай актыўнасці калектыву ГДУ, накіраванай на выкананне рашэнняў XXV х'езда КПСС, апублікаваныя ў шматтыражнай газеце «Гомельскі ўніверсітэт» сацыялістычныя абавязацельствы шырока абмеркаваць і рэгулярна змяшчаць матэрыялы аб іх выкананні пад рубрыкамі: «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!», «60-годдзю Вялікага Кастрычніка — дастойную сустрэчу!».

**(На працягу года, адказн. — рэктарат, партком, мясцком, камітэт ЛКСМБ, прафком, рэдакцыя газеты «Гомельскі ўніверсітэт»).**

2. Рэдакцыі газеты «Гомельскі ўніверсітэт» глыбока асвятляць практыку сацыялістычнага спаборніцтва, шырока паказваць вопыт работы перадавых кафедр і падраздзяленняў.

3. Партыйнай і прафсаюзнай арганізацыям універсітэта палепшыць практыку падвядзення вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва паміж кафедрамі, факультэтамі і падраздзяленнямі ўніверсітэта. Побач з вызначэннем пераможцаў у спаборніцтве даваць ацэнку дзейнасці кафедр, факультэтаў і падраздзяленняў, якія маюць сярэднія паказчыкі, а таксама адстаючых. Вызначыць і ажыццяўляць меры па ўхіленню прычын, якія мяшаюць рабоце. Устанавіць меры па далейшаму ўдасканальванню маральнага і матэрыяльнага стымулявання ўдзельнікаў спаборніцтва, цясней увязваць яго з канчатковымі вынікамі, высокай якасцю работы. Для пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва выдзеліць пяць льготных пуцёвак у дом адпачынку і пяць льготных турысцкіх пуцёвак па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа.

**Сацыялістычныя абавязацельствы абмеркаваны і зацверджаны на сумесным пасяджэнні рэктарата, парткома і мясцкома ўніверсітэта 13 студзеня 1977 года.**

*Сацыялістычны лад жыцця*

# У ПРАЦЫ НА КАМУНІЗМ—АСНОВА ПАТРЫЯТЫЗМУ

НАЙБОЛЬШ яркая форма праяўлення патрыятызму савецкіх людзей праз працу — гэта сацыялістычнае спаборніцтва. Яно прайшло слаўны шлях ад камуністычных суботнікаў да руху за камуністычныя адносіны да працы. З трыбуны XXV з'езда КПСС прагучаў гімн славы патрыятычным пачынам аўтазаводцаў Масквы, Горкага, Мінска, маскоўскім дынамаўцам, шахцёрам-тысячнікам Г. Смірнову, В. Мазурэнка, М. Чыха, брыгадзе будаўнікоў Мікалая Злобіна, тэкстыльшчыцам Я. Амосавай, А. Смірновай, В. Плятнёвай, В. Бабковай і інш.

Наша Радзіма ўступіла ў год свайго вялікага юбілею — год шасцідзесяцігоддзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Усе савецкія людзі імкнуцца сустрэць гэтую слаўную дату новымі здзяйсненнямі ў камуністычным будаўніцтве.

У пастанове ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ «Аб Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы, паспяховае выкананне заданняў дзесятай пяцігодкі» падкрэсліваецца неабходнасць «Шырока разгарнуць у 1977 годзе сацыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу 60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, уцягнуць у яго ўсіх рабочых, калгаснікаў, спецыялістаў з тым, каб значна перавысіць у юбілейным годзе планавыя заданні, стварыць надзейную гарантыю для паспяховага выканання пяцігодкі ў цэлым».

Працаваць лепш, павышаць эфектыўнасць і якасць — такі дэвіз спаборнічаючых за паспяховае ажыццяўленне сацыяльна-эканамічных задач, намечаных XXV з'ездам КПСС. Такі дэвіз і сацыялістычных абавязацельстваў калектыву нашага ўніверсітэта на 1977 год, якія былі прыняты нядаўна на сумесным пасяджэнні Вучонага савета, парткома і мясцкома і змешчаны ў сённяшнім нумары газеты. У іх комплексна прадстаўлены мерапрыемствы па паляпшэнню вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай, ідэйна-выхаваўчай работы, па павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

Спаборніцтва, як найбольш яркае праяўленне патрыятызму савецкіх людзей, адыгрывае першарадную ролю ў павышэнні прадукцыйнасці працы. Але гэтым не вычэрпваецца значэнне спаборніцтва. Спаборніцтва — складаная грамадская з'ява, катэгорыя, якая мае розныя аспекты — і эканамічны, і сацыяльны, і маральны, і ідэалагічны, і інтэрнацыянальны. Усе яны звязаны з савецкім ладам жыцця, савецкім патрыятызмам, іх праяўленнем і развіццём. «Спаборніцтва, — гаварыў Л. І. Брэжнеў, — аказвае глыбокае ўздзеянне на гаспадарчую палітыку, на грамадска-палітычнае жыццё краіны, на маральную атмасферу. Усяляк развіваць і далей сацыялістычнае спаборніцтва, рух за камуністычныя адносіны да працы. Такі наш агульны баявы лозунг». **(Матэрыялы XXV з'езда КПСС, с. 76—77).**

У ГЭТАЙ сувязі спынімся на наступнай праблеме. Калі мы гаворым аб працы, яе прадукцыйнасці, эфектыўнасці, якасці як асноўным, важнейшым элеменце патрыятызму, які праяўляецца перш за ўсё ў сацыялістычным спаборніцтве, у руху за камуністычныя адносіны да працы, мы не ацэньваем і не павінны ацэньваць працу з утылітарна практычных пазіцый, як гэта адбываецца ў буржуазным грамадстве. Нашы класавыя ворагі гавораць нам, што ў нас няма свабоды асобы, таму што ў нас існуе ўсеагульны абавязак працы, што мы жывём, каб працаваць, а яны працуюць, каб жыць. Гэта, канешне, не так. Вышэйшая каштоўнасць камунізму, яго галоўная мэта — не рэч сама па сабе, а чалавек, яго ўсебаковае развіццё. Вышэйшая мэта самой працы ў канчатковым выніку — не рэч, а развіццё чалавека. Рашаючым сродкам для ажыццяўлення гэтай вялікай мэты можа служыць толькі праца.

І для марксістаў праца не з'яўляецца і не можа з'яўляцца толькі звычайнай крыніцай пэўных эканамічных выгод, эфектаў. Яна з'яўляецца каштоўнасцю «самой у сабе», ажыццяўленнем якаснай сутнасці чалавека, сродкам пераўтварэння працы ў неабходнасць, развіцця здольнасцей чалавека, яго таленту. Менавіта ў працы выяўляюцца творчыя магчымасці чалавека, яго здольнасці, яго таленты.

Многія таленавітыя людзі, якія адчулі на сабе высакародную сілу працы, выказваліся за тое, што талент—гэта перш за ўсё згустак, крышталізацыя вялікай масы працы, і, відавочна, памылкова звязваць усебаковае развіццё чалавека сацыялістычнага ладу жыцця ў асноўным са свабодным часам. Развіццё, узбагачэнне чалавека, фарміраванне ўкладу жыцця адбываецца ў самой вытворчасці, у калектыве, праз сферу працы. Вельмі выразна сказаў аб гэтым вялікі рускі педагог К. Ушынскі. У артыкуле «Праца ў яе псіхалагічным і выхаваўчым значэнні» ён пісаў: «Без працы чалавек не можа ісці наперад, не можа заставацца на адным месцы, ён павінен ісці назад. Цела, сэрца і розум чалавека патрабуюць працы, і гэта патрабаванне такое настойлівае, што калі чаму-небудзь у чалавека не акажацца сваёй асабістай працы ў жыцці, тады ён страчвае сапраўдную дарогу і перад ім адкрываюцца дзве іншыя,— дзве аднолькава пагібельныя, — дарога няўтольнай незадаволенасці жыццём, панурай апатыі і бяздоннай нуды, або дарога добраахвотнага непрыкметнага самазнішчэння, па якой чалавек спускаецца да дзіцячых капрызаў або жывёльных асалод. На той і другой дарозе смерць авалодвае

**(Заканчэнне. Пачатак у № 2).**

**(Заканчэнне на 4-й стар.).**

